УДК 94 (476) “1919/1921”

# ПІНСК ВА ЎМОВАХ ПОЛЬСКА–САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ 1919–1921 ГГ.

***Сяргей Ісакаў***
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*
seregapinczyk@gmail.com

У артыкуле разгледжаны розныя бакі жыцця г. Пінска падчас польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. Прааналізаваны склад насельніцтва горада і грамадска–палітычнае жыццё. Артыкул арыентаваны ў першую чаргу для спецыялістаў–даследчыкаў гісторыі польска–савецкай вайны, гісторыкаў, а таксама для ўсіх тых, хто цікавіцца ваеннай гісторыяй Беларусі.

**Ключавыя словы: польска–савецкая вайна, грамадзянская адміністрацыя, ваенная адміністрацыя.**

# PINSK IN THE CONDITIONS OF THE POLISH-SOVIET WAR 1919-1921.

***Serhei Isakau***
*The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

The article examines various aspects of life in the city of Pinsk during the Polish-Soviet War of 1919–1921. The composition of the city's population and social and political life are analyzed. The article is primarily aimed at specialists-researchers of the history of the Polish-Soviet war, historians, as well as for all those interested in the military history of Belarus.

**Key words: Polish-Soviet war, civil administration, military administration.**

У 1915–1921 гг. горад Пінск уваходзіў у склад розных дзяржаўных утварэнняў : да 15 верасня 1915 г. горад быў у складзе Расійскай імперыі, потым кантраляваўся нямецкай ваенная акупацыйная адміністрацыяй «Oberbefehlshaber Ost». Юрыдычна па ўмовах Брэсцкага міру падпісанага 3 сакавіка 1918 г. горад увайшоў у склад Украінскай Народнай Рэспублікі (УНР), 25 студзеня 1919 г. першы раз была ўсталявана савецкая ваенная адміністрацыя, 5 сакавіка 1919 г. – першы раз усталявана польская ваенная адміністрацыя, 23 ліпеня 1920 г. – другі раз была ўсталявана савецкая адміністрацыя, 27 верасня 1920 г. была ўсталявана 2-і раз польская адміністрацыя. Па ўмовах Рыжскага міру, падпісанага 18 сакавіка 1921 г. горад увайшоў у склад Польскай рэспублікі.

Сітуацыя ў горадзе на пачатак 1919 г. у эканамічным і палітычным плане была спецыфічная. У горадзе была ўсталявана адміністрацыя Украінскай Народнай Рэспублікі, дзе большасць насельніцта складалі яўрэі, палякі, беларусы і рускія. Для кантроля горада патрэбны былі вайсковыя падраздзяленні. На першым этапе з тэрыторыі Украінскай Дзяржавы (Другі Гетманат) ў Пінск накіроўваліся гайдамакі, якія арганізоўвалі культурна–асветніцкую працу. Аднак з-за недаходу людзей у міліцыю і вайсковыя падраздзяленні, было прынята рашэнне пра арганізацыю дружын з мясцовых жыхароў. У Пінск для арганізацыі дружыны прыбыў восенню 1918 г. палкоўнік Смірноў і выдаў загад ад 25 лістапада 1918 г. аб арганізацыі пінскай добраахвотнай дружыны з былых афіцэраў Расійскай імператарскай арміі на чале з сотнікам Бахенскім і харунжыям Логвінавым. 1 студзеня 1919 г. дружына складалася з 127 афіцэраў, юнкероў і салдат, якія мелі вопыт службы, больш за 3-4 гады і пераважна

баявы досвед [1, s. 133]. На пачатку 1919 г. актывізаваліся партызанскія дзеянні паблізу г. Пінска супраць войск гетманшчыны, якія былі падтрыманы бальшавісцкімі войскамі. 22–25 студзеня адбываліся баявыя сутыкненні пад г. Пінскам паміж войскамі Дырэкторыі УНР і савецкай Расіі. Баявымі дзеяннямі кіраваў з савецкага боку Палескі Рэўкоў, які займаўся ўсталяваннем савецкай улады. Адрозненне Палескага Рэўкома ад іншых, было ў тым, што значную сілу мелі прадстаўнікі левага крыла расійскай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, якія пры заняцці горада пачалі барацьбу за ўладу з бальшавікамі. У выніку Расійская камуністычная партыя бальшавікоў (РКП(б) перамагла, і ўзяла ўладу ў свае рукі.

Савецкая ўлада пратрымалася крыху больш за месяц. 5 сакавіка 1919 г. у горадзе ўсталявалася польская ваенная адміністрацыя, якая праз некалькі тыдняў пачала фарміраваць грамадзяскую адміністрацыю. Пінскі магістрат складаўся всной 1919 г. з бургамістра Б. Барысевіча, лаўнікаў С. Кагля, М. Паўлоўскага і Я. Слуцкага, сакратара Ф. Мелеха, падсакратара О. Янцевіча і радных А. Пальчэўскага, Я. Мінковіча, доктара Кавальскага, Г. Цімафеева, К. Качэўніка, ксяндза і дэкана С. Войціка [2, арк. 41; 3, арк. 15 ; 4, арк. 40]. У лісце да жонкі ад 31 жніўня 1919 г. галоўнага квартэрмістр Літоўскага–Беларускага фронту капітан Станіслаў Раствароўскі пісаў пра сваё знаходжанне з інспекцыяй ў г. Пінску і прагулцы па Піне на маторцы: “Як бы нам добра было паехаць удвох на малай лодачцы па той цішы і пустэчы! Уяві сабе вялікую раўніну, як гарызонт, парослы чаротам, пад якім ільсніцца вада. Людзей вакол няма, з жывёл толькі водныя арлы лунаюць над балотам. Нават качак не бачна, такая пустэча як на моры. Пінск то наша польская Венецыя.” [5, s. 198].

11 верасня 1919 г. да павятовага камісару Пінска быў прысланы загад ад генеральнага камісара Грамадзянскага Упраўлення Усходніх Зямель (ГУУЗ) аб падрыхтоўцы да перапісу насельніцтва і складання спісу выбаршчыкаў. Для гэтай справы ў Вільні прызначалі галоўнага выбарчага камісара, які потым накіроўваў інструктароў у паветы, для арганізацыі перапісу [6, арк. 2]. Калі інструктар прыяжджал у павет, то павятовы камісар павінен быў аказваць яму ўсялякую дапамогу. Так у Пінску і пінскім павеце быў утвораны выбарчы камітэт. Згодна яго рашэння г. Пінск дзяліўся на раёны, па якіх павінны былі працаваць рахмістры (перапісчыкі). На адзін раён накіроўвалася ад 2 да 4 рахмістра. Перапіс праходзіў у лістападзе–снежню 1919 г. Канчатковыя дадзеныя былі падрыхтаваны 31 сакавіка 1920 г., згодна якім насельніцтва горада складала з 21 436 чалавек, з якіх 81, 21 працэнт складалі яўрэі, 7, 95 працэнта палякі, 3, 27 працэнта беларусы, 0,05 тутэйшыя і 7,52 іншыя нацыянальнасці. Перапіс канстатаваў факт, што большасцю ў горадзе з’яўляюцца прадстаўнікі яўрэйскай нацыянальнасці. Аднак гэтыя лічбы не маглі даць поўны зрэз насельніцтва горада, бо эвакуацыя 1915 г. рускага чынавенства і духавентсва зменшыўся працэнт рускіх у горадзе, што ў сваю чаргу павялічыла працэнт яўрэскага і польскага насельніцтва. А з прыходам польскіх вайскоўцаў, духавенства і чыноўнікаў ГУУЗ колькасна павялічыла працэнт палякаў у горадзе..

Летам 1920 г. пачалося наступленне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі (РСЧА) пад кіраўніцтвам М. Тухачэўскага. У выніку якога, горад 23 ліпеня 1920 г. быў заняты падраздзяленнямі Мазырскай групы войск без бою. З успамінаў кіраўніка аператыўнага аддзела групы Палессе маёра Станіслава Растваpоўскага, які знаходзіўся ў сярэдзіне ліпеня 1920 г. у г. Пінска і апісаў сітуацыю склаўшаюся ў горадзе падчас адступлення : “Быў зараз у касцёле ў Пінску, але за набажэнства было крыўдна. Хоць горад далёка размяшчаўся ад фронту, пробашч, для бяспекі зараз жа выяжджае і развітваўся са сваімі авечкамі, павучаўшы іх, што хрост з вады замяняе цэрэмарыял, адчуваю шкаду па споведзі, бо няма ксяндза. Людзішкі ў касцёле плакалі, а я пачырванеў за пробашча, бо мог яшчэ затрымацца хоць бы ў сялянскім адзенню, калі Пінск увогуле будзе ў небяспецы”. [5, s. 395]. 20 ліпеня 1920 г. у г. Пінску для падняцця баявога духу прайшоў парад падгалянскага палку Палескай групы, які прыймаў асабіста генерал Сікорскі (камандуючы аператыўнай групай Палессе). Захавалася апісанне параду і знешняга выгляду яго ўдзельнікаў: “ … Салдат меў на галаве стальны шлем, карабін праз плячо, але мундзіра і чаравік ужо не меў. Было толькі лахмецце, ногі былі паранены да крыві. Атрымаў мундыр, чаравік яшчэ многія атрымаць не змаглі, таму ішлі на парадзе, 10 салдат боса, хоць са стальнымі шлемамі на галаве. Генерал абходзіў шэрагі і размаўляў з людзьмі. Жолд выплацілі за 6 тыгодняў, далі папяросаў, таму маршыравалі спяваючы”.

Пасля заняцця войскамі С. Булак-Балаховіча 27 верасня 1920 г. г. Пінска і ўсталявання польскай адміністрацыі ў другі раз 13 кастрычніка 1920 г. прыбылі першыя чыноўнікі, якія сфарміравалі грамадзянскую адміністрацыю. Ваенная ўлада ў верасні-кастрычніку 1920 г. знаходзілася ў руках маёра Бачыньскага. 27 кастрычніка 1920 г. было накіравана прашэнне на імя павятовага старасты па пытанню ўтварэння Беларускага Палітычнага камітэту пры Народнай Добраахвотнай арміі генерала Булак-Балаховіча [7, арк. 7]. У прашэнні ішла гаворка аб дазволе на дзейнасць арганізацыі і падкрэслівалася, што ініцыатыва ідзе ад мясцовых беларусаў, якія пражываюць у горадзе. Такімі беларусамі з’яўляліся : п. Аляксандр Людвікевіч, п. Аляксандр Сокал і п. Мікалай Шахрай [7, арк. 7]. Арганізацыя павінна была дзейнічаць на тэрыторыі Пінскага і Мазырскага павету. Мэты камітэту былі наступныя : 1. Дазвол на культурна-асветніцкую працу па арганізацыі школ і гурткоў, 2. арганізацыя беларускага кааператыву, які б эканамічна даваў глебу для існавання і падтрымцы беларусаў, 3. абарона правоў беларусаў перад польскай адміністрацыяй на тэрыторыі Пінскага і Мазырскага павету. Пінск быў выбраны не выпадкова С. Булак-Балаховічам. Як паказалі далейшыя падзеі, горад выконваў функцыю тылавой базы для падрыхтоўкі “Палескага паходу” восенню 1920 г.

У кастрычніку 1920 г. у г. Пінску была адкрыта пачатковая школа імя Т. Касцюшкі на 500 дзяцей. Мова выкладання была польская, настаўнікамі школы ў пераважнай большасці былі палякі. Узначальваў школу Закевіч. Акрамя гэтай школы, была яшчэ адчынена 7-і класная руская гімназія. З грамадзянскіх арганізацый дзейнічала “Кола Полек”, якая дапамагала польскім салдатам у гаспадарчых пытаннях. Пры гуртку працава

чайная, чытальня і пральня для салдат. Арганізацыйны склад быў наступны : узначальвала арганізацыю пані Закевіч, яе намесніца – п. Ельясава, бухгалтар п. Грыбенка і сакратарка п. Карэйва [8, арк. 5]. У горадзе быў створаны клуб «Крэсы», які праводзіў культурна-асветніцкую працу сярод мясцовай інтэлігенцыі з ліку палякаў і рускіх. 5 мая 1920 г. у г. Пінску сваю дзейнасць клуб «Ognisko Polskie». Яго галоўная задача вызначалася ў правядзенні сходаў польскіх арганізацый, правядзенню канцэртаў і мерапрыемстваў. Акрамя культурных арганізацый у горадзе дзейнічалі гаспадарчыя кааперятывы і гурткі : «Самапомач», хрысціянскі кааператыў і «польскае акруговае таварыства». Пры падтрымцы Амерыканскага камітэту былі адчыненыя 3 дзіцячыя сады з кухнямі для яўрэяўскіх дзяцей.

Грамадзянская адміністрацыя ў горадзе знаходзілася ў руках магістрату, які складаўся на восень 1920 г. з бургаміcтра п. Каля, яго намесніка п. Кашэўніка і членаў магістрату пп. Паўлоўскага (паляка), Дзіміча (расіяніна), Кулера і Бакшанскага (яўрэі). Галоўныя праблемы, з якімі сутыкнуўся магістрат, былі звязаныя з гаспадарчымі пытаннямі. Кошт прадуктаў на рынку вырас у 4-5 разоў, быў недахоп газы і солі. Для прыкладу можна прывесці кошт 1 фунта масла (0,409 кг) – 450–500 польскіх марак, 1 пуда жыта (16,58 кг) – да 950 польскіх марак, што на той час было значнай сумай, якую можна было зарабіць за некалькі месяцаў. Кіраўніцтвам УпіЭТ было вырашана паслаць для дапамогі гораду 3 вагоны солі, 1 вагон зярна і бульбы. Месячны бюджэт магістрата складаў каля 150 000 марак [9, арк. 1]. Катастрафічны стан склаўся ў медыцынскай сферы, дзе нібыло ні лекаў, ні ўрачоў. Медыцынскі рыштунак быў вывезены адступаючай РСЧА. Усяго ў горадзе было 4 шпіталі. Павятовы шпіталь на 150 ложкаў, гарадскі шпіталь на 45 ложкаў, эпідэмілагічны шпіталь на 45 ложкаў і турэмны шпіталь на 20 ложкаў. Працавала гарадская амбулаторыя за кошт магістрату. У выніку ўсіх гэтых акалічнасцей, на тэрыторыі горада панавалі эпідэміі тыфа, малярыі, воспы. Таксама было зафіксавана некалькі выпадкаў іспанкі.

За бяспекай у горадзе сачыла паліцыя, якая займалася крымінальнымі і грамадзянскімі злачынствамі. Прыкладная колькасць іх у горадзе складала 65 чалавек. У асноўныя гэта былі паліцэйскія, якія прыбылі з этнічнай тэрыторыі Польшчы. Другой інстанцыяй, якая займалася наглядам за палітычным становішчам і польскай арміяй у горадзе з'яўлялася палявая жандармерыя. Яна складалася з пастарунка жандармерыі ў складзе 20 чалавек [10, арк. 6]. Галоўная функцыя структуры была ў кантролі і наглядзе за настроям мясцовага насельніцтва. Жандармерыя была адказная за бяспеку на чыгуначным вакзале. Бо ён меў стратэгічнае значэнне для польскага войска.

Пінск падчас польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. фактычна з'яўляўся першым горадам у Брэсцкай акрузе ГУУЗ. Менавіта таму розныя грамадзянскія ўстановы былі размешчаны ў Пінску, а не ў Брэсту. Адной з акалічнасцю гэтага выбару было тое, што горад падчас Першай Сусветнай вайны 1914–1918 гг і нямецкай акупацыі не зазнаў такіх разбурэнняў як Брэст. З лютага па верасень 1921 г. менавіта Пінск быў галоўным цэнтрам Палескага ваяводства. Аднак 7 жніўня 1921 г. адбыўся пажар, які знішчыў цэнтр горада. Было вырашана перамясціць галоўны горад Палескага ваяводства ў Брэст. Горад толькі застаўся рэлігійным і культурным цэнтрам ваяводства.


1. Bechta, B. Pińska Drużyna Ochotnicza – Pińsko–Wołyński Batalion Ochotniczy 1918–1919. Przyczynek do dziejów rosyjskich antybolszewickich oddiałów wojskowych w Polsce / M. Bechta // Psmo społeczno-historyczne Glaukopis. – Piaseczno : Glaukopis, 2021. – S. 33 –54.
2. Дзяржаўны Архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф.2001. Воп. 1. Спр. 14. Пратаколы паседжанняў магістрату і гмінных рад: спісы членаў гмінных рад.
3. ДАБр. – Ф.2001. Воп. 1. Спр. 6. Пратаколы паседжанняў магістрату і гмінных рад: спісы членаў гмінных рад.
4. ДАБр. – Ф.2001. Воп. 1. Спр. 3. Спісы солтысаў і іх намеснікаў у гмінах Пінскага павету.
5. Rostworowski, J. Listy z wojny polsko-bolszewickiej 1918-1920. Z frontu litewsko-białoruskiego oficera sztabowego gen. Szeptyckiego i Sikorskiego do świeżo poślubionej żony / J. Rostworowski. – Warszawa-Kraków : Wydawnictwo Mireki, 2015. – 489 s.
6. ДАБр. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 4. Перапіска з кіраўніком Брэсцкай акругі аб правядзенні выбараў у магістрат і гмінныя рады Пінска.
7. ДАБр. – Ф. 2001. Воп. 4. Спр. 175. Статут публічнага клубу і заявы грамадзянскіх арганізацый аб выдачы ім дазволаў а працу.
8. ДАБр. – Ф. 2001. Воп. 4. Спр. 100. Загад №1 Кіраўніка белагвардзейскай групы Балаховіча, захоп г. Пінска і яго ваколіц.
9. ДАБр. – Ф. 2001. Воп. 4. Спр. 5. Цыркуляры і загады Грамадзянскага Упраўлення Усходніх Зямель аб утварэнні і распараджэнні бюджэтаў гмін, крэдыты і іх улік.
10. ДАБр. – Ф. 2001. Воп. 4. Спр. 105. Загад №1 Дэкадныя справаздачы павятовай жандармерыі аб грамадска-палітычным становішчы на тэрыторыі павета.